ў названым вершы, усё ж, не лірычны суб’ект, а створаная карціна прыроды. У полі зроку аказваюцца зоркі, небасхіл, гай, лес, луг. Прастора паўстае высока адухоўленай, нават ідэальнай мясцінай-казкай. Тут *“Агнявыя валаконцы // Ткуцца ў шоўк чырвоны” , а “ хмаркі ладзяць сонцу // І дзяньку кароны”* [1, с. 16], а Сонца выступае найвышэйшым увасабленнем касмічнага агню, а таксама сімвалам ідэальнага ўпарадкавання свету.

Верш здзіўляе і сваёй празрыстай стройнай кампазіцыяй. Нараджэнне новага дня паказваецца ў дынаміцы. Так, завязка – “*Чуць-чуць дрогне, пралiецца //Чырвань на усходзе*”, развіцце дзеяння – “*Час сьвітаньня – час зычлівы…Гаснуць, нікнуць зоркі”*, якое дасягае сваёй кульмінацыі ў наступных радках: “*Шырай, шырай заранiца // Разьнімае крыльле, // Нібы пожар б’е крыніцай // Там, на небасхіле*”. І завяршае ўсё – развязка – “*І сабрала неба фарбы // Колераў дзівосных”* [1, с. 16].

У пейзажнай лірыцы Я. Коласа прырода дорыць чытачу вельмі многа асобных тонкіх, няўлоўных адчуванняў. Душа лірычнага суб’екта пейзажных вершаў як бы наросхрыст раскрыта для ўспрымання прыгажосці, разлітай у навакольным свеце.

Пейзажны жывапіс Я. Коласа – гэта арыгінальная эстэтычная з’ява, якая для паэта паўстае не толькі як аб'ект маляўнічага жывапісання, але як і аснова глыбокага духоўнага і філасофскага пазнання чалавечай душы.

Літаратура:

1. Колас, Я . Песні жальбы. Казкі жыцця / Я. Колас. – Мінск : Маст. Літ., 2007. – 230 с.
2. Виноградов, В. В. О языке художественной литературы / В. В. Виноградов. – М., 1959. – 657 с.
3. Гумилев, Н. С. О стихотворных переводах. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://gumilev.ru/clauses/5/. – Дата доступу: 06.10.2024.

## П'ЕСА «ДАМАВІЧКІ» ЯГОРА КОНЕВА ЯК УЗОР СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІЧНАЙ КАЗКІ

**Пацапей Н. Р.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук Тарасава С. М.

Паводле слоўніка В. Рагойшы, «*Драматургія – сукупнасць твораў драматычнага роду літаратуры, п’есы ўсіх відаў і жанраў*» [1, с. 61]. Але гэта паняцце абазначае і від мастацтва, які мае даўнія вытокі, што бяруць пачатак з далёкай антычнасці. На працягу свайго развіцця гэты напрамак нязменна прыцягваў пісьменнікаў, актыўна ўбіраў у сябе новыя ідэі, паўставаў перад чытачамі ў самых разнастайных формах.



Репозиторий ГрГМУ

Дзіцячая драматургія з'яўляецца адным з адгалінаванняў драматургіі. У шырокім сэнсе дзіцячая драматургія ўяўляе сабой п'есы, напісаныя для дзяцей, якія разлічаны не толькі для чытання, але і для пастаноўкі ў тэатры. Пытанні дзіцячай драматургіі ў сваіх работах разгледзелі такія літаратуразнаўцы, як А. Трафімчык (манаграфія «Беларуская дзіцячая драматургія», 2012), Ф. Драбеня (артыкулы «Сучасная дзіцячая драматургія: сюжэты, матывы, вобразы», «Сюжэты літаратурных казак у сучаснай беларускай драматургіі для дзяцей») і інш. Неабходна падкрэсліць, што беларуская дзіцячая драматургія дастаткова разнастайная па сваіх тэматычных і жанрава-стылёвых увасабленнях. Па меркаванні Ф. Драбені, у дзіцячай драматургіі «*вызначаюцца тры своеасаблівыя тэндэнцыі: 1) апрацоўка вядомых фальклорных і літаратурных сюжэтаў, пераасэнсаванне шматлікіх фальклорных матываў і вобразаў; 2) стварэнне ўласна літаратурных казак; 3) інсцэніроўкі – адаптацыя вядомых літаратурных і фальклорных твораў для пастаноўкі на сцэне*» [2, с. 7].

Жанр драматычнай казкі ў беларускай літаратуры праявіў сябе яшчэ ў «нашаніўскі» перыяд. Ён змог знайсці сваіх прыхільнікаў і ў пазнейшыя перыяды развіцця драматургіі. Драматычныя казкі для дзяцей стварылі З. Дудзюк «Сінязорка», «Жывая вада», С. Кавалёў «Драўляны Рыцар», «Хохлік», І. Сідарук «Кветкі пад ліўнем», Л. Рублеўская «Янук, рыцар Мятлушкі» і інш. Да дзіцячай драматургіі звярнуўся і Ягор Конеў, беларускі драматург, празаік, публіцыст, якому належаць п’есы-казкі «Калядная зорка», «Дамавічкі» [3].

На жаль, грунтоўнага даследвання дзіцячых дрматычных п'ес Ягора Конева яшчэ не праводзілася. Таму праблемна-тэматычныя абсягі дзіцячай драматургіі, жанравая адметнасць яго п’ес застаюцца неакрэсленнымі, мала згадак знаходзім і пра іх мастацкую спецыфіку.

У казцы «Дамавічкі» Я. Конеў уздымае спрадвечную праблему, якая не ў меншай меры блізкая і дзецям – праблему адвечнай барацьбы дабра са злом. Названая п’еса з’яўляецца творам, які можна аднесці да жанру ўласна літаратурнай казкі, хаця вобразы герояў п’есы Я. Конева пераклікаюцца з персанажамі беларускай міфалогіі. У казцы Я. Конева дзейнічаюць дамавічкі Шушык і Жуля, якія выступаюць супраць лютай Мары, што з’явілася, каб знішчыць усё жывое. Не гледзячы на рознагалоссі і непаразуменні, якія спачатку ўзнікаюць паміж дамавічкамі, галоўныя героі перамагаюць зло сваёй знаходлівасцю, самаадданасцю. Для п’есы Я.Конева характэрны асаблівы момант, які адрознівае яе ад класічнай дзіцячай казкі: аўтар не дзеліць персанажаў на станоўчых і адмоўных. Шушык і Жуля не ідэальныя персанажы, у іх, як і ў звычайных людзей, ёсць свае недахопы. Але на працягу твора героі праходзяць выпрабаванні, якія мяняюць іх у лепшы бок. У іншым п’еса-казка Я. Конева блізкая іншым творам падобнага жанру. Дзеянне ў іх разгортваецца ў выдуманым, фантастычным свеце ў нявызначаны прыдуманы час, прысутнічаюць звышнатуральныя сілы, у фінале выяўляецца належна добрае завяршэнне канфлікту.



Репозиторий ГрГМУ

У п’есе «Дамавічкі» аўтар падае два міжасабовыя канфлікты – канфлікт паміж Шушыкам і Жуляй і канфлікт паміж названымі героямі і Марай. Згодна з меркаваннем даследчыка, і ў творы Я. Конева *«канфлікт фармальна адбываецца паміж персанажамі, а фактычна паміж абагульненымі чалавечымі якасцямі, псіхалогіямі, а значыць – паміж каштоўнасцямі рознай палярнасці»* [4, с. 99].

П’еса-казка мае павучальны характар. Яна вучыць дзяцей быць дружнымі, дапамагаць адзін другому ў цяжкіх сітуацыях. Твор шчодра напоўнены ўстойлівымі выразамі. Варта адзначыць і такую асаблівасць пабудовы сюжэту п'есы, як непасрэдны зварот яе герояў з пытаннямі да гледачоў, што прыкметна ажыўляе п'есу і робіць чытача ці гледача непасрэдным сўдзельнікам дзеяння.

Дзіцячыя п’есы Ягора Конева сведчаць пра далучанасць пісьменніка да класічных традыцый драматургіі, і ў той жа час у іх пазнаецца прысутнасць адзнак новага часу, што фарміруе індывідуальны стыль творцы. Аўтар стварае каларытны і запамінальны малюнак рэчаіснасці, перадае багатую гаму пачуццяў, што перажываюць яго героі. Яго творы вылучаюцца канфліктнай вастрынёй, сутыкненнем супрацьлеглых пазіцый і меркаванняў, увагай да духоўных праблем сучаснага грамадства. Адзначаючы стылявую спецыфіку драматургічных твораў Я. Конева можна канстатаваць: творца мае адметны склад светаўспрымання і вобразатворчасці, своеасаблівы характар пісьма.

Літаратура:


1. Рагойша, В. Літаратуразнаўчы слоўнік : тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў/ В. Рагойша. – Мінск : Нар. асвета, 2009. – 303 с.
2. Драбеня, Ф. Дзіцячая драматургія Сяргея Кавалёва / Ф. Драбеня // Літаратура і мастацтва. – 2012. – № 10. – 12 сакавіка. – С. 7.
3. Конеў, Я. Дамавічкі / Я. Конеў // Дарункі добрых духаў: п'есы для аматарскіх тэатраў / уклад. Г. Каржанеўская, І. Скрыпка. – Мінск, 2007. – С.59
4. Трафімчык, А. Беларуская дзіцячая драматургія: манагр. / А. Трафімчык. Мінск, 2012. – 128 с.


## КАФЕДРАЛЬНЫ САБОР СВЯТОГА СІМЯОНА СТОЎПНІКА: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ


**Пелля А. Д.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.


Мэтай дадзенай працы з’яўляецца вывучэнне гістарычнага мінулага і сучасны стан кафедральнага сабора святога Сімяона Стоўпніка; паказ гістарычнай значнасць сабора ў жыцці гараджан.



Репозиторий ГрГМУ